*З Днём настаўніка віншуе*
*Яе сёння ўвесь наш клас!*

*Няхай паўсюль, няхай заўсёды*
*Натхняе радасць добрых слоў,*
*І гордай будзе ўзнагародай*
*Дзяцей павага і любоў!*

*Дзеці ўручаюць настаўніцы кветкі.*



**Бібліятэкар.** нагадваю вам, што гэты тыдзень у Беларусі праходзіць пад знакам чаго? Правільна, тыдзень бацькоўскай любові. І сёння да нас на урок завіталі нашы матулі. Прыміце і вы словы віншавання.

***Эдзі Агняцвет "Першае слова"***

**Дзяўчынка.**

*Першы голас, які я пачула на свеце,*
*Быў голас маці.*
*Калыханку пад месяцам і на дасвецці*
*Спявала мне маці.*
*Запаветныя, родныя фарбы і гукі –*
*Усё застаецца.*
*Дзякуй, мама, за рукі,*
*Бяссонныя рукі,*
*За адданае сэрца!*
*Не пакрыўджу цябе,*
*З тваіх сцежак не збочу,*
*Засланю ад нягоды.*
*Я хачу, каб свяціліся радасцю вочы*
*І жыла ты заўсёды!*

**Хлопчык.**

*Бог высокі табе*
*Даў мяне нарадзіць,*
*Мама.*
*Ты вучыла мяне*
*Гаварыць і хадзіць,*
*Мама.*
*Справядлівым мяне*
*Прывучаеш ты быць,*
*Мама.*
*Мне з табою людзей*
*І Радзіму любіць,*
*Мама.*
*Маё першае слова ў жыцці –*
*Мама.*
*Першы мой падарунак – табе,*
*Мама.*
*Ты – сардэчнае свята маё,*
*Мама.*

*Дзеці ўручаюць кветкі мамам.*

**Бібліятэкар.** Урок наш заканчваецца. Спадзяёмся, што ён прынёс шмат шчаслівых хвілін нашым любімым матулям і настаўнікам. Дзякуй за ваш клопат, за вашу штодзённую, такую патрэбную працу!

Дзеці згодныя са мной. Часам мы крыху засмучаем вас, але ж робім гэта, паверце, незнарок.

Дзякую за супрацоўніцтва, жадаю далейшых поспехаў, да новых сустрэч!




Т. ЛАЎРЫК
Мінская абласная бібліятэка
імя А.С. Пушкіна

# Падвядзенне вынікаў абласнога праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю"

**З верасня 2022 па снежань 2023 года ў Мінскай вобласці намаганнямі публічных бібліятэк рэалізоўваўся абласны літаратурна-краязнаўчы праект "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю". Асновай для стварэння абласнога праекта стаў асветніцкі праект "На хвалі часу, у плыні жыцця" (2019-2023), які рэалізоўваўся Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі сумесна з партнёрамі. Ініцыятарам абласнога праекта выступіла Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна, якая з'яўляецца каардынатарам працы публічных бібліятэк Мінскай вобласці. Рэалізоўвалася ініцыятыва бібліятэкамі Міншчыны сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і яго філіяламі, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, Выдавецкім домам "Звязда" (газетай "Літаратура і мастацтва"), Саюзам пісьменнікаў Беларусі, часопісам "Полымя" і Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам юнага гледача.**




Гэты праект – адна з формаў краязнаўчай дзейнасці, задачай якой з'яўляецца захаванне памяці пра знакамітых пісьменнікаў-землякоў праз рэалізацыю разнастайных мерапрыемстваў на базе бібліятэк: святочных імпрэз; літаратурных і мастацкіх конкурсаў; правядзенне круглых сталоў і прэзентацый; падрыхтоўку кніжных выстаў пісьменнікаў і гучных чытанняў іх мастацкіх кніг; удзел у навуковых канферэнцыях, дзе ёсць магчымасць падзяліцца вопытам і распавесці пра свае ініцыятывы; кантактаванне з роднымі пісьменнікаў; стварэнне літаратурных экспазіцый – музейных куткоў, прысвечаных знакамітым землякам, і іншыя формы. Праект завяршыўся падвядзеннем вынікаў абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка на сайце бібліятэкі, які праходзіў з 15 сакавіка па 15 снежня 2023 года. Такая форма праектнай дзейнасці на сённяшні дзень вельмі запатрабаваная сярод буйных бібліятэчных сетак. Яна спрыяе не толькі рэалізацыі краязнаўчай дзейнасці, але і дазваляе палепшыць імідж і рэйтынг афіцыйнага рэсурсу ўстановы, павялічыць колькасць віртуальных наведванняў бібліятэчнага сайту.

Стварэнне віртуальнага музея, кабінета ці старонкі пісьменніка патрабуе збору матэрыялаў, кантактавання з музеямі і архівамі краіны; для падачы матэрыялу ў інтэрнэт-прасторы – выканання пэўных патрабаванняў і, у першую чаргу, магчымасці ажыццяўлення такой працы сіламі супрацоўнікаў бібліятэкі. У планах Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна – падрыхтоўка выдання "Мемарыяльныя віртуальныя музеі на сайтах бібліятэк: метадычныя рэкамендацыі па стварэнні", да рэалізацыі якога далучаны бібліятэкі – удзельніцы абласнога конкурсу. Для таго каб падштурхнуць бібліятэчных супрацоўнікаў, навучыць і дапамагчы ў стварэнні віртуальных праектаў, былі арганізаваны майстар-класы, прайшлі круглы стол "Виртуальные музеи, информационные ресурсы публичных библиотек" (у рамках абласной школы метадыста (10.11.2022) і абласны семінар на базе Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі "Продвижение чтения: организация информационного пространства в библиотеке" (20.04.2023).

У 2022 годзе ў Мінскай вобласці сваімі віртуальнымі рэсурсамі пра пісьменнікаў маглі пахваліцца не так шмат бібліятэк. Сярод самых яркіх трэба адзначыць віртуальны музей Паўлюка Труса, створаны Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя П. Труса ў 2015 годзе, і віртуальны кабінет Фёдара Гурыновіча, які рэалізоўваўся сумесна з пісьменнікам на сайце Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі з 2020 года.

Праектам "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю" і конкурсам зацікавіліся многія раённыя бібліятэкі Мінскай вобласці, прычыны прыняць удзел у ім у кожнай установы былі свае. Напрыклад, Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка шмат гадоў ушаноўвае памяць дзіцячага пісьменніка Васіля Віткі (1911-1996). Пачынаючы з 2008 года праходзяць штогадовыя Майскія Віткаўскія чытанні. У гэтым годзе ў рамках акцыі "Культурная сталіца Беларусі г. Слуцк" удалося закласці алею Васіля Віткі з адкрыццём памятнага каменя, якая знаходзіцца недалёка ад вуліцы Васіля Віткі. Стварэнне такога віртуальнага музея на сайце цэнтральнай бібліятэкі, які сабраў бы ўвесь фактаграфічны і бібліяграфічны матэрыял пра пісьменніка, было даўно ў планах. Такім чынам, конкурс падштурхнуў да ажыццяўлення задуманага.

Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка ў гэтым годзе запусціла афіцыйны сайт, пакуль ён толькі напаўняецца новымі матэрыяламі. Для павышэння іміджу бібліятэкі і прасоўвання яе ў прасторы сацыяльных сетак праца над новымі інфармацыйнымі рэсурсамі, якія будуць спрыяць і росту віртуальных

наведванняў сайта, вельмі неабходна. Таму збіраліся матэрыялы па творчасці і ўшанаванні памяці на Лагойшчыне земляка – народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча (1931-2016).

Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева стварыла віртуальны музей пісьменніка-земляка Леаніда Рашкоўскага (1937-1994), які змяшчае поўныя тэксты кніг пісьменніка, яго публіцыстыку, аблічбаваныя матэрыялы пра яго. У мэтах прасоўвання рэсурсу супрацоўнікі бібліятэкі плануюць стварэнне віртуальнага клуба літаратараў-"карчагінцаў" (пісьменнікаў, якія маюць інваліднасць). Зараз калектыў бібліятэкі ўзяўся за рэалізацыю ідэі стварэння Мемарыяльнай літаратурнай прэміі імя Л. Рашкоўскага "Преодоление".

**12 снежня ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна прайшло пасяджэнне сяброў журы абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка на афіцыйных сайтах бібліятэк Мінскай вобласці.**

У склад журы ўваходзілі спецыялісты абласной бібліятэкі і прадстаўнікі з іншых бібліятэк, далучаныя ў якасці незалежных экспертаў: галоўны бібліятэкар аддзела суправаджэння інтэрнэт-партала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Ганна Солушка і старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікола Трус. Запрашэнне спецыялістаў з іншых устаноў дало магчымасць найбольш аб'ектыўна ацаніць віртуальныя кантэнты, даць незалежную адзнаку кожнаму рэсурсу. Журы прааналізавала ўсе пададзеныя на конкурс праекты і адзначыла іх станоўчыя і адмоўныя бакі.

На конкурс свае працы прадставілі: Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева, Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка, Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча, Мінская раённая цэнтральная бібліятэка, Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка, Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка, Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча, Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка, Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Труса.

- Дыплом 1-й ступені за стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка атрымалі дзве публічныя бібліятэкі: Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка – за віртуальны музей Васіля Віткі "Народжаны пад знакам паэзіі" і Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка – за віртуальны кабінет Фёдара Гурыновіча, які быў значна перапрацаваны за час дзейнасці абласнога праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю".
- Дыплом 2-й ступені атрымала Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса за віртуальны музей Паўлюка Труса, які таксама вельмі актыўна папаўняўся і дапрацоўваўся ў 2022–2023 гадах.
- Дыплом 3-й ступені атрымалі: Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча – за рэсурс "Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча" і Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка – за "Віртуальны музей народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча".

Заахвочвальнымі дыпломамі былі адзначаны: Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка ім. І.Х. Каладзеева – за ўклад у развіццё літаратурнага краязнаўства ("Виртуальный музей Леонида Рашковского"), Мінская цэнтральная раённая бібліятэка – за актыўную працу па папулярызацыі віртуальнага музея Язэпа Пушчы, Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча – за даследчую працу ў рамках віртуальнага музея Міколы Нікановіча, Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка – за паспяховы старт пры стварэнні віртуальнай старонкі Міхася Парахневіча.

Усе прадстаўленыя на конкурс віртуальныя рэсурсы будуць размешчаны на сайце Мінскай абласной бібліятэкі ў раздзеле "Краязнаўчы цэнтр" (літаратурнае краязнаўства), а таксама для пераможцаў, якія занялі першае і другое месца, рэкамендавана ў абавязковым парадку далейшая папулярызацыя сваіх рэсурсаў на абласных, рэспубліканскіх і міжнародных бібліятэчных навукова-практычных мерапрыемствах.

Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна таксама далучылася да абласнога конкурсу па-за яго межамі, бо з'яўляецца яго арганізатарам. Максім Багдановіч (1891–1917) – беларускі пісьменнік, асоба якога зацікавіла супрацоўнікаў бібліятэкі, і менавіта яму прысвячаліся мерапрыемствы ў рамках праектнай дзейнасці. На новым сайце бібліятэкі https://pushkinka.by/ можна пазнаёміцца з віртуальным музеем Максіма Багдановіча, які быў падрыхтаваны сумесна з Літаратурным музеем Максіма Багдановіча і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, размяшчэнне якога стала завяршэннем праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю" ў Мінскай абласной бібліятэцы.

18 снежня 2023 года ва ўстанове прайшоў літаратурны вечар "Па Максімавых сцежках", прысвечаны дню нараджэння песняра, на якім былі падведзены вынікі дзейнасці бібліятэкі ў рамках праекта, а таксама быў прэзентаваны новы віртуальны рэсурс.

Адчыніла мерапрыемства дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Наталля Вашчыла, якая адзначыла значэнне творчасці Максіма Багдановіча для Беларусі і падкрэсліла неабходнасць далейшай працы па напаўненні толькі створанага рэсурсу бібліятэкі сумесна з іншымі зацікаўленымі ўстановамі, якія захоўваюць матэрыялы, звязаныя з творчасцю пісьменніка.







Ад партнёраў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча на мерапрыемстве выступіў загадчык філіяла Міхаіл Бараноўскі, які паведаміў пра новае адкрыццё, зробленае ў багдановічазнаўстве, – іншая дата нараджэння пісьменніка (10 снежня).



Прыемным падарункам для бібліятэкі сталі кнігі, прысвечаныя творчасці Максіма Багдановіча, якія былі перададзены музеем у фонды ўстановы.

Трэба адзначыць, што з дазволу даследчыкаў творчасці пісьменніка Міхаіла Бараноўскага і Ірыны Мышкавец у віртуальным музеі размешчаны поўныя тэксты артыкулаў з перыядычных выданняў, якімі можна карыстацца ў адкрытым доступе.

Прэзентавала віртуальны музей, створаны сумесна некалькімі аддзеламі бібліятэкі, загадчык аддзела бібліятэказнаўства Таццяна Лаўрык, ініцыятар і куратар абласнога праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю". Гледачам была прадстаўлена магчымасць "прайсціся па Максімавых сцежках" віртуальнага музея і пазнаёміцца з кожным яго раздзелам. Асобна быў зроблены акцэнт на матэрыялах з фондаў партнёраў, прадастаўленых падчас сумеснай працы, якія аздобілі старонкі рэсурсу.






Шмат цёплых слоў ад розных выступоўцаў на вечары прагучала ў адрас міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў "Пад Зоркай Венеры", які праходзіў у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна ў 2022 годзе да дня нараджэння пісьменніка. Яркімі акцэнтамі святочнага мерапрыемства сталі выступленні майстроў жывога слова, у выкананні якіх прагучалі творы Максіма Багдановіча: Аляксея Дубоўскага, прызёра Рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка", і Ганны Маркавай, вучаніцы Магілёўскага дзяржаўнага абласнога ліцэя № 1, фіналісткі і пераможцы ў 2021 і 2022 гадах Рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка", а таксама пераможцы міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў "Пад Зоркай Венеры".

Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна выказвае шчырую падзяку партнёрам, даследчыкам, пісьменнікам, якія сумесна з публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці працавалі над праектам "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю", які завяршыў сваю працу натхняльнымі вынікамі!

ISSN 1818-4278
9 771818 427006 24003

## Чытайце ў наступным нумары:

- Библиотека как пространство больших возможностей и перспектив в воспитании краеведческой культуры
- По их судьбе прошла война
- Веселая зоология